*Ігар Пракаповіч*

# ХІРУРГІЧНАЯ АДЫСЕЯ ДЗЯДЗЬКІ АНТОНА

*ПАЭМКА*

*Мінск, «Кнігазбор», 2009*

www.kamunikat.org

**Пракаповіч І. М.**
Хірургічная адысея дзядзькі Антона / Ігар Пракаповіч. –

©Пракаповіч І., 2008
©Атрахімовіч І., малюнкі, 2008
©Афармленне

www.kamunikat.org

# ХІРУРГІЧНАЯ АДЫСЕЯ ДЗЯДЗЬКІ АНТОНА

**Лекарам і хворым усёй зямлі беларускай прысвячаецца**

## ПРАДМОВА ДА ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

Шаноўны чытач!

Ты маеш асалоду пазнаёміцца з першым выданнем паэмы Дзядзькі Антона “Хірургічная Адысея”, якую ён напісаў (дакладней – склаў), калі ў лютым 1998 года лячыўу бальніцы свой апендыцыт.

Можна дараваць аўтару ягоныя некаторыя грубаватыя выразы, ўзяўшы на ўвагу ягонае вяскова-сялянскае паходжанне і тое, што ягонымі настаўнікамі былі радыё, тэлевізар і вуліца.

Рэдактар вельмі шкадуе, што Дзядзька Антон не дазволіў уключыць у першае выданне паэмы аж тры самастойныя часткі.

Адна з іх мае назву “Любімыя жанчыны” (у чарнавой рэдакцыі – “Каханыя матроны Дзядзькі Антона”), у якой ён апісвае з усіх бакоў прыгажосць жанчын, якія працуюць у хірургічным аддзяленні бальніцы, і якія ўскалыхнулі ня толькі ягоную душу, але і некаторыя іншыя часткі цела. Адмову ад публікацыі Дзядзька Антон растлумачыў тым, што будзе парушана ягоная рэпутацыя прыкладнага сем’яніна, а таксама

www.kamunikat.org

тэкст гэтай часткі можа выклікаць з'яўленне непажаданых размоў, плётак, прыдумак, якія здольны кінуць цень на жанчын, якіх ён моцна пакахаў.

Другая частка, якая адсутнічае ў паэме, мелася быць названа “Гераічнае паданне пра ня менш гераічныя ўчынкі нашых хірургаў”. Яна пакуль што засталася ня скончанай, бо ў Дзядзькі Антона выявіўся вялікі дэфіцыт слоўнага запасу гераічнай тэматыкі. Ён запэўніў, што пазбавіцца гэтага недахопу і закончыць паэму пасля таго, як паглядзіць па тэлевізары трансляцыі ў Дзень Канстытуцыі, 1 мая, 9 мая і ў Дзень Рэспублікі.

Трэцяя частка, якую аўтар назваў “Хірургічныя законы ад Дзядзькі Антона” знята з выдання па прычыне яе нізкалітаратурнага грубавата-вульгарнага тону і да таго ж з прычыны разыходжання поглядаў аўтара з поглядамі афіцыйнай медыцынскай навукі.

Уцэлым, паэма аказвае танізуючае ўздзеянне на арганізм, стымулюе стварэнне новых смехатэрапічных клетак і нават рэкамендуецца Мінздравам (праўда, не ўказана каму).

Прыемнага чытання, шаноўны чытач!

## ПРАДМОВА ДА ДРУГОГА ВЫДАННЯ.

Пасля першага (рукапіснага) выдання “Хірургічнай Адысеі” мінула тры гады, але інтарэс да паэмы павольна і няўхільна працягвае расці. Гэта назіраецца па таму, як людзі перапісваюць ад рукі, ксеракапіруюць і вучаць напамяць ці ўсю адысею, ці яе кавалкі, ці толькі асобныя цытаты. Бачачы такую любоў народных мас да свайго твора, Дзядзька Антон

звярнуўся да мяне з просьбай арганізаваць перавыданне “Хірургічнай Адысеі”. Як і было дамоўлена, аўтар дапоўніў паэму яшчэ трыма часткамі (“Гераічнае паданне”, “Любімыя матроны” і “Хірургічныя законы”), у выніку чаго твор набыў быццам бы завершаныя рысы. Трэба заўважыць, што ў “Гераічным паданні” моцна адчуваецца ўплыў беларускага тэлебачання, радыё і іншых сродкаў масавай інфармацыі. У “Любімых матронах” рэдактар вымушаны быў выразаць з паэмы ладны кавалак тэксту з-за дужа інтымных падрабязнасцяў, якія апісвае аўтар, а “Хірургічныя законы” далёка адышлі ад канонаў медыцыны і фармакалогіі разам узятых і больш нагадваюць заклікі партыі і ўрада да наведвальнікаў і часовых жыхароў бальнічных устаноў.

Каб надаць сваёй паэме больш важкасці, Дзядзька Антон навёў масты з вядомым беларускім паэтам-гумарыстам Янусем Мальцам і даў яму на прачытанне свой опус. Мэтар паэзіі зрабіў шмат крытычных заўваг, але ўцэлым ухваліў літаратурна-хірургічныя практыкаванні маладога (у сэнсе творчага вопыту) паэта. Акрылены, як Пегас, Дзядзька Антон прыцягнуў да мяне свінячы кумпяк, літар гарэлкі і свой твор. Такая грунтоўная падрыхтоўчая работа дала свой плён: чытач мае задавальненне адчуць смак і асалоду ад чытыння “Хірургічнай Адысеі Дзядзькі Антона”.

Прыемных хвілін табе, чытач! (на жаль, без кумпяка і без гарэлкі).

Аўтар-укладальнік Ігар Пракаповіч.

I

## ЗАЧЫН

Я, просты вясковы дзядзька Антон,
Пусты, як пусты паляўнічы патрон,
Ды хітры, як а –
мерыканскі шпіён,
Будувам баіць пра свой палон.

II

## НЕЧАКАНЫ ПАЛОН

Нядзеля была. І знесла кура
яечка.
На вуліцы снег. А ў хаце – цяпло.
Бо печка.

Сабраліся ўсе з бліжэйшай радні,
і я
піў самагонку і еў агуркі
да дня.

І цёпла было. І быў я саўсім
вясёлы.
Адзеты заснуў, ды раптам прачнуўся
голы.

Кажух знікнуў мой. І бабы няма
Пад бокам.
І нешта тырчыць, ды моцна баліць
Пад вокам.



Памацаў – фінгал! А ўзяўся адкуль?
Хоць трэсні,
Не ўспомню ніяк апошняй застольнай
Песні!

І дзе ж гэта я? Засела ў трыбух
Трывога.
Ці ў пекла сышоў? Ці трапіў у рай
Нябога?

Але тут якраз заскрэбаў прусак
За вухам.
А побач мыша знянацку ўсчала
Хрумскаць.

Знаёмыя гукі. Я пільнасць згубіў
Адразу.
І хутка захроп, пад коўдру паддаўшы
Газу.

І хоць я заснуў, здаецца, зусім
Няпільна,-
Усё-ткі пачуў, як раптам святло
Ўключылі.

Падняў галаву – хацеў паглядзець
Наўкола,
Аж бачу – о цуд! – глядзіць на мяне
Анёлак.



www.kamunikat.org

Ружовыя шчочкі, пухнатыя вусны.
Вочкі
Глядзяць так выразна, як быццам сказаць што
Хочуць.

І шапачка белая, белы халат –
Як міла!
Ды думка мільгнула:"Адзе ж у анёла
Крылы?"

І поп мне казаў, і бачыў у храме
Гэта,
Што крылы анёл трымае заўжды
Ў паветры.

Ды хутка спакой ізноў увайшоў
У сэрца –
Анёлак рукой адно мне пагладзіў
Месца.

Іяразамлеў, як млее мужык
Ад ласкі
Паверыў у рай, як верыць дзіцё
У казкі.

Аж тут – о-го-го!– прыйшлося завыць
Ад болю.
Ці ж думаў я, лунь, што гэты анёл
Уколіць?



www.kamunikat.org

Дрыжэў мой кумпяк, пакуль там лілося
Зелле,
З вачэй жа маіх слязамі цякло
Пахмелле.

Мне кажа анёл:"Не плачце так слёзна,
Хворы,
Мы фарбы жыцця прыгожыя вам
Падорым.

"Трымайся, мужык, - азваўся тут нехта
зблізу, -
ляжы, не скулі, і вытры насоўкай
пысу".

Прыйшлося ўцяміць, што я не ўраі
Далёка.
Ды дзе я – бабы ж няма
Пад бокам?

### III

### АКЛІМАТЫЗАЦЫЯ

Ляжу ў бальніцы ў хірургічным аддзяленні
Я – хворы ў невядомым пакаленні.
У гэтым ложку шмат людзей ляжала –
І вось тут сёння мае косці, маё сала.

Папраўдзе, сала мала ў мяне,

Бо я вясковы просценькі аскет,

Падобны я на ёга (ува сне):
Жывот маленькі і ба-альшы шкілет.

І ўсё таму, што ем саўсім не так,
Чым нашыя найноўшыя паны,
Ня пхнуўрыла розны там кан'як,
А самагоначку цягну сваёй цаны.

Ну гэта так, да слова, бо сусед
Ня можа, бачу, брухам павярнуць.
А есці як пачне – а мой ты свет! –
Ня стоміцца рука кілбасы пхнуць!

Ці збоку вось яшчэ мужык ляжыць,
Зусім зялёны – кроўды малако.
Ён скардзіцца, што дыхалка баліць,
А цыгарэты смаліць – о-го-го!

Кажу яму: кідай, дурны, курыць,
Кульні ты лепей чарку перад сном.
Дык і ня слухае – адвернецца і спіць,
Як быццам я параіў яму зло.

Сямёра ў палаце насляжыць,
Але астатнія… - ды што пра іх казаць?
Паціху дыхаюць і, пэўна, хочуць жыць.
І ў размовах часта клічуць "маць".

www.kamunikat.org

## IV

## АБХОД

“Эй ты, мужык, - “зялёны” кажа мне, -
Ідзе абход, рыхтуйся адказаць
Чаму з цябе так самагонкай прэ
І што фінгалам будзеш асвятляць?”

Ад гэтых слоў затросся я, як ліст,
Хоць ад народзін быў не баязлівы.
Падумаць могуць: “сымулянт”, “артыст” –
І выкінуць, нібы гнілую сліву.

Хутчэй, хутчэй на морду макіяж –
Фінгалі шчокі мылам паднацёр.
Паружавеў, нібы прыдворны паж,
Глынуў ўадэкалону, як акцёр.

І вось – абход. Заходзяць утраіх.
Чацвертая, Маруся, медсястра.
А трое гэтых? Што чакаць ад іх?
Ці лямантуі поўхі? Ці дабра?

З чырвоным тварам, ваблівы, ляжу,
Прыкінуўся бы хворы – горкі хрэн.
Павекі мружу, ўважліва гляджу
На дзікі вось такі эксперымент.

Вось першы хлопец, досыць малады,
У халаціку і штоніках, як снег –

Нібы важак абходнай чарады,
Вядзе і кансультуе ён калег.

“Дацэнт, ня меней…” – кінуў я мазгой.
І рукі ёсць, Напэўна рэжа ўсё ж.
Няўжо разаблачыць ён мой запой?
Малюся ціха:”Божа ж, Божа мой…”

А той, другі, Прафесар, не інакш.
Таксама ў белым. З ладнай барадой.
І ён, здалося, мусіць лекар наш –
З усімі размаўляе, як з раднёй.

Каго памацае, каго і шчыкатне,
Запіша нешта ў ксёнжачку сваю.
Ну, думаю, ён вытурыць мяне,
І “Алілуя” ціхенька пяю.

Абходчык трэці не прафесар, не –
Ён Акадэмік, пэўна, на ўсе сто.
Вось гэты добры, гэты не кране.
Ён можа кансультантам тут, ці што?

Прыйшоў нарэшце рэй і да мяне.
Ляжу, як камень, дыхузаняло.
“Ну што баліць? Ты дыхаеш ці не?
Паказвай нам хутчэй, дзе дапякло”.

“Жывот баліць” – маню скрозь зубы я.
“Здымай штаны!” – камандуе “дацэнт”, -

www.kamunikat.org

“Нудзе?” – Кажу “крыху ніжэй пупа” –
і чую сам, што даманіўся ўшчэнт.

Ніколі там жывот мне не балеў,
Ды што рабіць – маніць дык і маніць.
“Дацэнт” націснуў так, што я самлеў,
Ах, Божа ж мой, так можна задушыць!

Ну і Прафесар ціскаў на жывот,
Качаў незадавольна галавой.
З ілба мне Акадэмік выцер пот:
“Скажы яшчо спасіба, што жывой”.

Яны пайшлі, а я, як анямеў,
Як доўбняй хто ўлабэшнік усадзіў.
Я ж так, пажартаваў…Я не хацеў…
Я проста ўчора дужа многа піў.

“Так што, мужык, табе – апендыцыт, -
сусед пузаты гучна аб’явіў, -
Ды гэта лепей, браце, чым цыстыт,
І лепей, чым на задніцы нарыў”.

Авохці мне! Патрапіў у палон.
Зміры ўся з лёсам, плюнуў і ляжу.
І думаю, што, пэўна, мне праклён
Паслаў Пан Бог за тое, што брашу.



www.komunikat.org

V

## НА ДЗЯРЖАЎНЫХ ХАРЧАХ

Зацяўся ўвесь. І трызню ўва сне.
Ды раптам голас гучны разбудзіў:
“Хадзячы, есці! Чуеш ты, ці не?
Яшчэ ты ходзіш, ці ўжо адхадзіў?”

Адкрыў я вочы – бачу прад сабой
Пякнейшую з вядомых мне жанчын:
І твар, і рукі – проста сырадой,
А формы роўна пад мой густ і чын.

Пяшчотнае хацеў я штосць сказаць,
А яна ўбачыла, што я яшчэ жывы –
Пакінула мне крупнік пахлябаць,
Ізнікла, як знікаюць міражы.

А хворыя, бы крабы з-за вуглоў,
Паказваюць хто клюшню, хто руку,
І потым гэдак важна да сталоў
Ці рухаюцца, ці то мо грабуць.

Я назіраю гэты ўвесь працэс
І цешуся, што сёрбаю супец,
Якая розніца: “апендыкс” ці “абсцэс”,
Калі ў страўніку пайшоў устабілізец?

VI

## КЛ. СТАН.
## (клізмавае становішча)

Як толькі страўнік коткай завурчаў
І ў вены хваляй рушыла цяпло,
Успомніў арганізм, што мала спаў –
І розум зноў у мроі панясло.

Але нядоўгім плаванне было
Ў салодкім моры дзесці між багоў:
Прыйшоў “дацэнт” і словам, як калом,
Разбіў ушчэнт лагодны ветразь сноў.

“Ты еў ці не?” – пачуў пытанне я, -
кажу, што троху сёрбаў у абед,
І рот адкрыў на словы каяння,
Ды абарваў ён: “Руш на клізму, дзед!”

“Аё-я-ёй! За што такі пасаж? –
За ўсё жыццё не меў такіх пакут…”
Прамармытаў у роспачы “я шчас…”,
Пайшоў за ім, як конь ідзе ў хамут.

Ды дзякуй санітарцы – як радню
Сустрэла мяне ласкаю сваёй,
“Мо зробіш сам?” – “Не, цётка, не зраблю –
Ні разу не гуляў такой гульнёй…”

А сам дрыжу, ах, Божа, як дрыжу.
Усё жыццё яду прымаў у рот.

www.kamunikat.org



www.

А тут накормяць, хоць і не прашу,
З дакладнасцю зусім наадварот.

Гаршчок прынесла санітарка мне
І як малога стала ушчуваць.
І пачалося… Толькі б ува сне
Не давялося гэта паўтараць.

Аж пяць разоў, нібы балотны лунь,
На унітаз ляцеў, як на гняздо,
І там угнойваў, як араты рунь,
Чым з жывата і рвала, і няслo.

## VII

## “СМАЛЕННЕ ВЯПРУКА”

І толькі ледзь аціх парад вантроб,
Як клічуць зноў у ванны той пакой,
А слёзы з вочак брызнулі, як боб –
Я не хачу! Вярніце мне спакой!

Але ж пайшоў, як вол той пад ярмо,
З каменнямі на сэрцы і ў душы,
Там выдалі мне лёзы і станок:
“Галіся, дзядзька, нішчы валасы.”

З палёгкай дыхаю: знаёмы мне занятак,
Гляджу у люстру, бачу ўласны твар,
І думаю:”Які ўсё ж тут парадак –
Шчацінне рэдкае, а вось давай жа, пар”.



Згаліўся чысценька, блішчу, як агурочак,
Блішчыць і свеціцца адмыты мой фінгал.
Пайшоў здаваць і лёзы, і станочак,
Ды там сустрэў мяне зусім другі фінал.

“Вы тут згаліліся, а там хоць ці скранулі?”

сястра пытаецца так ветліва ў мяне,
І пазірае ўніз, ніж эй кашулі,
А я пытаюся неўразумела: “Дзе?”

“Ну як жа дзе? Уніз ад жывата,”
“І ногі?” – “Ногі не чапайце”.
І павяла мяне мая бяда,
І апрацоўваў, бедны, свае сцёгны.

## VIII

## АПЕРАЦЫЯ

А ўсё наступнае было, як у “кіне”:
Далі укол, паклікалі кудысь,
Пасля – укрыжавалі на стале
І, як наморднік,
маску ў рот мне – цісь!

…Прачнуўся я парэзаны, пабіты,
але, напэўна, без апендыцыту.



www.kamunikat.org

## IX

## ЛЮБІМЫЯ МАТРОНЫ ДЗЯДЗЬКІ АНТОНА

Мае каханыя жанчыны…
Бальнічны ложак мой рыпіць.
Без вас не бачуя прычыны
Далей лячыцца тут і жыць.

Каму спатрэбіцца мой розум
І цела гладкае маё,
Калі я перайду на прозу,
На празаічнае жыццё?

Ня быць рамантыку калекам,
Пакуль ад вогненных вачэй
Душа ўзлятае, як камета
З хвастом інтымнейшых надзей.

Бальніца – файная мясціна:
Жанчын тут многа і дзяўчат.
Такія ёсць – аж пусцішсліну
І рот раскрыеш, як вар'ят.

Вядома мне: у інстытуты
На медыцынскі факультэт
Ёсць нефармальны конкурс мудры
На прыгажосць.
Адкрыў сакрэт!

Ды што дакторкі?! А медсёстры?!
Як глянеш – кружыць галаву,

www.kamunikat.org

А падміргнеш, дык позірк востры
Цябе пасадзіць “на іглу”.

Канешне, жонка – гэта добра,
Пад бокам, што ні гавары,
Але, бывае, што, як з кобрай,
З ёй мусіш колькі часу жыць.

А ў бальніцы – іншы нумар:
Мацуйся, сілы набірай.
Як ёсць язык, а ў слове гумар, -
Любую дамку выбірай.

Напрыклад, я пасля наркозу,
Як толькі ў цела адышоў,
Адчуў, што з дзеўкай пад бярозу
Мог дапаўзці б без дактароў.

А як пачаў хадзіць, то, праўда,
Наладзіў плесці нераты,
Каб заманіць туды прынадай
І сталых баб і маладых.

У дні ружовай маладосці
Казалі гэдак мужыкі:
Жанчыну трэба браць без злосці
На мыла, рэчы і духі.

Прынаду дай – яна ў нерат
Сама свядома паплыве.



www.kamunikat.org

А ты цягні яе на бераг
(У ложак, значыць, да сябе).

Цяпер прынады дужа мала –
Жанчыну трэба раскруціць:
Дарыць ёй вершы, эпіграмы,
І пра каханне гаварыць.

Ня кожны гэткае ўмее.
Які ў бальніцы кантынгент?
Адзін – стары, другі – хварэе,
А трэці – дык інтэлігент.

А я ж саўсім інакшых сокаў,
І кроў жвавейшая мая.
Я на жанчыну кіну вокам
І ўжо планую што і як.

Адну ……………………………
……………………………………
……………………………………
…………………………………

---

Мае каханыя жанчыны,
Вы - холад мой і жар душы.
Зірну на сочныя рабіны
І ўспомню вас…
Як смачна жыць!



www.kamunikat.org

## X

## ГЕРАІЧНАЕ ПАДАННЕ

У час, калі краіна наша
Ідзе да новых перамог,
Калі наш мудры дзядзя Саша
Усім нам бацька, цар і бог,
Калі калгаснік і рабочы
Працоўным полымем гараць,
Тады паэт заўжды ахвочы
Герояў гімнамі ўслаўляць!

І я не буду выключэннем,
І пра хірургаў-дактароў
З замілаваннем-захапленнем
Перакажу паданне зноў.
О гераічнае паданне!
Нясеш ты з веку ў вякі
Жывога часу адчуванне
І цвёрдасць думкі і рукі.

Даруй, рабочы і калгаснік,
Што не пра вас вось гэты сказ,
Бо для мяне й цяпер не гасне
Хірургаў профіль і анфас.
І вам канешне зразумела:
Каб нешта важнае рабіць,
Здаровым трэба быць і смелым,
І дактароў сваіх любіць!



www.kamunikat.org



www.kanunlkat.org

Я гераічнае паданне
Хірургам нашым прысвяціў–
Яны таксама узмаганні
За ураджай палёў і ніў:
Яны гаючымі рукамі
Працуюць (не шалтай-балтай),
Каб мы здароўя не гублялі,
І каб квітнеў наш родны край.

…Быў месяц май.
Буяла ўсё наўкола.
Квітнеў наш горад і наш край.
Змяркалася,
Бо сонечнае кола
Скацілася за небакрай.

У гэты час цягнулі на каталцы
Ў трупярню чалавека аднаго.
Памёр, нябога, хоць і быў пры чарцы –
Ня выпіў, шчыры, зелля ўсяго.

Згубілі пільнасць хлопцы-канваіры,
Зваліўся той нябожчык на асфальт –
Ляжыць сабе ў прасціне без мундзіра –
Ні рысы “STOP”, ні нават шыльды “HALT”.

І трэба ж так, як раз у гэтым часе
Ляцеў на “Аўдзі” дробны бізнесмен.
Канешне ж выйшла прыкрае няшчасце –
Гамульцы зарыпелі – але ж, хрэн!

Папаўся гэны дзядзечка пад колы.
Не марыў, пэўна, ён пра гэткі лёс
А бізнесмена кінула у холад,
З вачэй паліўся буйны лівень слёз.

Каліж патоп аціх з яго вачэй,
Ён варухнуў разважліва мазгамі.
Хутчэй сляды замесці…Так, хутчэй!
А то згніеш за кратамі з клапамі.

Нябожчыка ў багажнік – і на газ!
Прывёз да рэчкі і спіхнуў з абрыву.
І той паплыў праз горад і калгас
Ссінелы і пабіты, быццам сліва.

І як на тое ноччу браканьёр
Цягаў патроху сетачкаю рыбку.
І раптам выцягнуў – (ледзь бедны не
памёр!)-
Ці то русалку, ці карыятыдку.

Але прыгледзеўся…Прыкметы паказалі,
Што гэта ўсё ж ткі не яна, а ён.
Тут сэрца браканьёрава аджалю
Забілася і нарадзіла стогн.

Куды падзець? Куды схаваць тапельца?
І падказаў тут грукат цягніка –
На рэйкі палажыла тое цельца
Спужаная фігура рыбака.

Шчэ не паспеў абсохнуць адкупання
І паглядзець на зорачкі нябёс,
Як з таго боку, скуль ішло світанне,
Расклад цягнік з цыстэрнамі прынёс.

Як ён трубіў, пужаючы ахвяру!
Стагналі дужа доўга тармазы.
Чыгуначнік, саўсім збляднеўшы з твару,
Парэшткі цела кінуў у кусты.

Араніцай сябры з БэПэСэЭму,
Мерапрыемства ладзячы ўкустах,
(Я ім, канешне, прысвячу паэму!)
пераджылі магутны шок і жах.

Яны знайшлі нябожчыка ўмаліне
І паказалі свой сапраўдны спрыт:
Яго вадой настойліва крапілі,
Прамылі раны і наклалі бінт.

Зрабілі дружна штучнае дыханне,
Намацалі ледзь-ледзь прыкметны пульс,
І не марудзячы хвіліна ў на чаканне,
Яго на “хуткай” вывезлі адтуль.

Ў рэанімацыю нябожчыка паклалі
І пачалі што трэба з ім рабіць,
Урэшце рэшт хірургам перадалі,
Кабтыя вырашылі, колькі дзядзьку жыць.



www.kamunikat.org



А тыя таго дзядзечку – на стол.
Наркоз, юпітэры і ўсё такое.
І, як казаў генсек, “працэс пайшоў”.
Куды пайшоў? – ня ведаць нам з табою.

З аперацыйнага амаль праз пяць гадзін
Хірург нарэшце выйшаў аб’явіць:
“Зрабілі ўсё на межах нашых сіл.
Канешне, цяжка, але будзе жыць!”

Змахнуўшы з твару шчыра й працы пот,
Пайшоў хірург без лаўраў, без букета.
Ён яшчэ зробіць, як заўжды, абход
І перавяжа нейкага паэта.

…Красуйся, край!
Квітней, мая краіна!
Ідзі ўпартым крокам да зары!
Ніхто цябе не выпхне з каляіны,
Бо ў цябе ёсць выдатныя майстры!

Краіна й незаўважаных герояў
Увойдзеш ты ў гісторыі анал.
Сыходзіць эра летуценняў-мрояў,
Прыйшла эпоха бітвы за метал!

На гэтай я ўна філасофскай ноце
Заканчую свой гераічны сказ.
Хірург заўжды чакае на рабоце
кагосьці з вас…



www.kamunikat.org

## XI

## БАЛЬНІЧНЫЯ ЗАКОНЫ АД ДЗЯДЗЬКІ АНТОНА

1

Калі ўбальніцы мусіш ты лячыцца,
Забудзься пра жанчыну без спадніцы.

2

Каліты любіш водарны букет,
Лажыся у вялікую палату.
Як дзесяць мужыкоў з'ядуць буфет, -
Тады газуць дружна і заўзята.

3

Калімоцна забаліць,
Не стагні, не енчыся.
Яшчэ,можа, будзешжыць,
Бо на тое ж лечышся.

4

Не кладзі пятлю на шыю,
Не бяры да сэрца.
Дзе разрэжуць,там зашыюць –
Болей не парвецца.



www.kamunikat.org

5

Дактароў любі не словам,
Не вялікім дзякуем,
Агасцінцам адмысловым,
Дзе бутэлька звякае.

6

У бальніцы не лянуйся –
Ешпаболей і мацуйся!

7

На уколы не пужайся –
Лепшадразу аддавайся!

8

Ведай кожны павучэнне:
Болей спіш– хутчэй лячэнне!

9

Аперацыі не бойся!
Што яе баяцца?
Акаханых супакойце –
Будзе чым кахацца.

10

Першым будзеш усталовай –
Паясі, як дома.

11

Калі хочаш быць здаровы,
Еш як свінні ці каровы!

12

Як прачнешся, пагаліся,
Зубы вычысці, памыйся,
Атрымай укол, пілюлю
Ды ізноў кладзіся ўлюлю.

13

Мой калега! У акно
Не шпурляй таблеткі,
Бо закуплены яны
За мяжой за “дзедкі”(або за “бабкі”).

14

Як падставіш кумпячок,
Аня йдзе шпрыц тонкі, -
Наждачок вазьмі, дружок,
Падвастры іголкі.

www.kamunikat.org

15

Любі медыцынскіх сясцёр, чалавек!
Яны дапамогуць прадоўжыць твой век!

16

Будзь аптымістам у часе лячэння
І прыйдзе хутчэй да цябе аблягчэнне!

17

Час дарэмна не губляй,
Не гуляй у карты.
Свой узровень павышай,
Калі кніжак варты.

18

Як ідзеш на праграванне,
Не забудзь пра адзяванне!

19

Мілы мой, не дуры галавы.
Калі моцна баліць – гавары,
Калі слаба баліць, то ляжы
І ня енчыся, і не крычы.

www.kamunikat.org

20

У бальніцы, брат, лячыся –
Піпаболей імачыся.

21

Калі прыйдзе медсястра,
Не кажы ні слова.
Зад свой выстаў (да хваста)
Ічакай уколу.

22

Усе тут роўныя – іты не выключэнне.
Нясі, як крыж зямны, сваё лячэнне!

www.kamunikat.org

ЗМЕСТ

Прадмова..........................................................3
I Зачын..............................................................6
II Нечаканы палон...............................................6
III Акліматызацыя................................................10
IV Абход.............................................................12
V На дзяржаўных харчах.....................................15
VI Кл. стан (клізмавае становішча)......................16
VII “Смаленне вяпрука”.........................................18
VIII Аперацыя.......................................................20
IX Любімыя матроны............................................21
X Гераічнае паданне.............................................24
XI Бальнічныя законы ад дзядзькі
Антона...........31

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Пракаповіч Ігар Міхайлавіч**

**ХІРУРГІЧНАЯ АДЫСЕЯ ДЗЯДЗЬКІ АНТОНА**
*Паэмка*

Рэдактар Янусь Малец
Мастак Іосіф Атрахімовіч
Камп’ютэрны набор і вёрстка І. Пракаповіч

www.kamunikat.org